

БЕЛАРУСКІ САД НА САХАЛІНЕ

ЧЫМ СЁЛЕТА ЗДЗІВІЦЬ «СЛАВЯНСКІ БАЗАР»? СТАР. 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 120 (28736)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Работа па спыненні карупцыі і далей будзе прынцыповай, максімальна адкрытай і галоснай. Кожны, хто служыць толькі на карысць уласным інтарэсам, панясе пакаранне па ўсёй строгасці закона. У краіне працягваецца работа па прадухіленні карупцыйных злачынстваў. Яна праводзіцца пастаянна, сістэмна і ахоплівае ўсе сферы — ад рэальнага сектара эканомікі, сацыяльнай сферы да дзяржаўнага кіравання. Галоўнае патрабаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да кіраўнікоў усіх узроўняў — сумленная і прыстойная праца на карысць краіны і беларускага народа. Менавіта такая задача ставіцца кіраўнікам пры іх прызначэнні на дзяржаўныя пасады, і менавіта па гэтым крытэрыі даецца прынцыповая ацэнка іх працоўнай дзейнасці».*

# НОВАЯ ГОНТА ДЛЯ АДАМАВАЙ ХАТЫ

**У Навагрудку па праграме падрыхтоўкі горада да 220-годдзя з дня нараджэння славутага земляка Адама Міцкевіча на тэрыторыі Дома-музея паэта пачалася замена старых дахаў гістарычных будынкаў. Рэканструкцыю праводзяць спецыялісты Навагрудскай ПМК-156.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Пытанне скарачэння дэкрэтнага водпуску ў Беларусі не разглядаецца.**
- Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь у маі 2018 года склала BYN943,9.



- **ААТ «ААБ Беларусбанк» з пачатку года накіравала на крэдытаванне малога і сярэдняга бізнесу амаль BYN500 млн.**
- «Беларуснафта» ў чэрвені прасвідравала 6-мільённы метр праходкі горных парод.
- **Прэзентацыя турыстычных магчымасцяў Мінска прайшла ў французскім Ліёне.**
- У Беларусі больш за ўсё карупцыйных злачынстваў выяўлена ў сферах транспарту і прамысловасці.

■ Сацыяльны вектар

# «МОЖА, МНЕ ТРЭБА ЦЯПЕР УЖО ВЫСВЯТЛЯЦЬ, КОЛЬКІ «НАЦІКАЛА» СТРАХАВОГА СТАЖУ?»



## Мінпрацы адказала на пытанні пра пенсіі

**Як не трапіць у «пенсійную пастку»? Ці могуць прызначыць пенсію за памерлага мужа жонцы, якая знаходзілася на яго ўтрыманні? Як пацвердзіць стаж працы, калі згубілася працоўная кніжка? Калі ІП некалькі гадоў не плаціў пенсійныя ўнёскі, ці будзе ўлічаны гэты перыяд пры прызначэнні пенсіі? Гэтыя і іншыя пытанні паўставалі на анлайн-канферэнцыі «Пытанні пенсійнага забеспячэння», якая была арганізавана Міністэрствам працы і сацабароны сумесна з БелТА.**

**На іх адказвалі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валерый КАВАЛЬКОЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Мінпрацы і сацабароны Наталля МУРАШКЕВІЧ і намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Ларыса ЯШКОВА.**

СТАР. 4

■ Нерухомасць: тэндэнцыі

# Мінск у чаканні студэнцкага буму

## «Хапуна» яшчэ няма. Пакуль няма

**Набліжаецца чарговы навучальны год, і іншагароднія абітурыенты ўжо на ўсю моц накіраваліся ў сталіцу на ўступныя экзамены. На гэтым фоне ўласнікі кватэр спадзяюцца на сезоннае павышэнне цаны арэнды. Але ці будзе яно сёлета? Як будучым студэнтам можна сэканоміць на арэндзе, і якія кліенты менш пажаданыя для гаспадароў? Пра гэта журналісту газеты «Звязда» расказвае начальнік аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.**

Асаблівых змен па частцы доўгатэрміновай арэнды кватэр за мінулы год не адбылося, лічыць яна. Але тое зусім не падстава адкладаць пошук кватэры на самы апошні момант. Шмат у чым гэта датычыцца студэнтаў. Некаторыя з іх да пачатку заняткаў не паспяваюць знайсці прыдатную па месцазнаходжанні і кошту кватэру і таму вымушаны з прыходам верасня браць першае, што трапляецца на вочы. А ў цане падобных варыянтаў часцяком тоіцца «надбаўка за тэрміновасць».

### Мінімум — 360 рублёў

З пазіцыі попыту бягучы год працягвае традыцыі мінулага: найбольш папулярныя аднапакаёвыя кватэры, за імі — двухпакаёвыя. На трохпакаёвыя кватэры попыт мінімальны.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!